ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспубліка Беларусь
28.08.2019 N 144

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ "БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА" ДЛЯ XI - XII КЛАСАЎ ДРУГОГА АДДЗЯЛЕННЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛ (СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛ-ІНТЭРНАТАЎ) ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ З ПАРУШЭННЕМ СЛЫХУ

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

У адпаведнасці з вучэбным планам другога аддзялення спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) для дзяцей з парушэннем слыху (далей - спецыяльная школа), у якіх навучанне вядзецца на рускай мове, на другой і трэцяй ступенях агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжана вывучэнне вучэбнага прадмета "Беларуская мова і літаратура".

Вучэбная праграма па вучэбнаму прадмету "Беларуская мова і літаратура" (далей - вучэбная праграма) падрыхтавана ў адпаведнасці з канцэпцыямі вучэбных прадметаў "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Структура дадзенай вучэбнай праграмы ўключае два ўзаемазвязаныя раздзелы: "Беларуская літаратура" і "Беларуская мова". Навучанне беларускай мове ў спецыяльнай школе абумоўлена практычнай накіраванасцю, прадугледжвае рэалізацыю камунікатыўна-дзейнаснага падыходу і ажыццяўляецца на аснове літаратурных тэкстаў, прадугледжаных у дадзенай вучэбнай праграме раздзелам "Беларуская літаратура". З дапамогай мастацкіх тэкстаў спазнаецца багацце лексікі, адметнасць марфалагічнага, сінтаксічнага складу беларускай мовы.

**Мэты вывучэння** - сфарміраваць аснову сістэмы ведаў пра мову і маўленне; далучыць да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа; фарміраваць на гэтай аснове чытацкую і маўленчую культуру; садзейнічаць выхаванню чалавека з развітым пачуццём нацыянальнай годнасці і самапавагі, патрыёта; развіваць камунікатыўную, духоўна-маральную, грамадзянскую і мастацка-эстэтычную культуру навучэнцаў.

**Задачы:**

забяспечыць засваенне асноў сістэмы беларускай мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу) *(моўная кампетэнцыя)*;

фарміраваць асновы камунікатыўных уменняў праз засваенне моўных узораў; уменне ўспрымаць пісьмовы літаратурны тэкст, разумець яго сэнс і пераказваць *(камунікатыўная кампетэнцыя)*;

садзейнічаць усведамленню беларускай мовы і літаратуры як формы выражэння нацыянальнай культуры *(сацыякультурная кампетэнцыя)*.

Вывучэнне беларускай мовы у спецыяльнай школе не павінна абмяжоўвацца азнаямленнем навучэнцаў з моўнымі адзінкамі і законамі. Вынікам навучання з'яўляецца авалоданне навучэнцамі ўменнямі працаваць з тэкстамі на беларускай мове як асноўнай крыніцай ведаў у гэтай галіне.

Неабходна ўлічваць, што навучэнцы з парушэннем слыху інакш успрымаюць маўленне. Для іх характэрна няпоўнае, фрагментарнае ўспрыманне моўнага матэрыялу на слых і, як вынік, парушэнне разумення сэнсу, што выражаецца ў асабістым маўленні дзяцей. Улічваючы блізкасць беларускай і рускай моў, трэба складаць спецыяльныя ўмовы для навучання беларускай мове навучэнцаў з парушэннем слыху. Пераважаючым спосабам успрымання моўнай інфармацыі (улічваючы абмежаваныя магчымасці ўспрымання на слых) павінна быць зрокавае ўспрыманне пісьмовага літаратурнага тэксту. З мэтай забеспячэння адэкватнага разумення можа быць выкарыстана жэставая мова (для тлумачэння сэнсу асобных слоў і іх спалучэнняў у сказах, скрытага сэнсу тэксту і г.д.). Моўныя практыкаванні павінны спалучацца з тэкстам, які вывучаецца.

У працэсе навучання фарміруюцца наступныя кампетэнцыі: моўная, камунікатыўная і сацыякультурная.

**Моўная кампетэнцыя** прадугледжвае засваенне асноў сістэмы беларускай мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу); здольнасці успрымаць, асэнсоўваць змест тэкставай інфармацыі і прадуцыраваць просты тэкст на беларускай мове.

**Камунікатыўная кампетэнцыя** разглядаецца як авалоданне навучэнцамі здольнасцю ўспрымаць выказванні на беларускай мове, разумець іх сэнс і самастойна складаць выказванні розных тыпаў з улікам камунікатыўнай сітуацыі.

**Сацыякультурная кампетэнцыя** прадугледжвае абагульненне ведаў пра асаблівасці нацыянальнай культуры, нацыянальных традыцый, далучэнне да культурных здабыткаў беларускага народу.

Вучэбны прадмет "Беларуская мова і літаратура" цесна звязаны з матэрыялам вучэбных прадметаў "Руская мова", "Руская літаратура", "Гісторыя". Так, веды пра часціны мовы, сфарміраваныя ў працэсе вывучэння вучэбнага прадмета "Руская мова", з'яўляюцца асновай для разумення навучэнцамі з парушаным слыхам асаблівасцей іх напісання і ўжывання. Звесткі пра жанравыя асаблівасці твораў рускай літаратуры дапамагаюць навучэнцам усвядоміць аналагічныя паняцці пры вывучэнні беларускай літаратуры.

У працэсе выкладання вучэбнага прадмета "Беларуская мова і літаратура" педагагічны работнік выкарыстоўвае агульнадыдактычныя і спецыяльныя прынцыпы (нагляднасці; сістэматычнасці; сувязі з іншымі прадметамі; карэкцыйнай накіраванасці навучання; выкарыстання "абыходных шляхоў" навучання; камунікатыўнай накіраванасці і інш.).

Пры выкладанні вучэбнага прадмета "Беларуская мова і літаратура" выкарыстоўваюцца вусная, пісьмовая і жэставая формы маўлення (з улікам абмежаванай магчымасці ўспрымання на слых). Найбольшая ўвага павінна надавацца фарміраванню разумення сэнсу выказванняў рознай складанасці на беларускай мове, суадносінам рускай і беларускай моў (лексіка, граматыка, фанетыка, сінтаксіс).

Выкарыстоўваюцца разнастайныя метады навучання. Асноўнымі з іх з'яўляюцца наглядныя і практычныя.

Змест дадзенай вучэбнай праграмы прадугледжвае наяўнасць у кожным класе ўзаемазвязаных раздзелаў:

"Беларуская літаратура";

"Беларуская мова".

Увесь моўны матэрыял даецца з апорай на вывучаемыя творы мастацкай літаратуры. Педагагічны работнік мае права самастойна вылучаць аб'ём тэкстаў, прадугледжанных для вывучэння раздзелам "Беларуская літаратура" (ажыццяўляць адбор урыўкаў з твораў) з улікам узроўню слыхамоўнага развіцця навучэнцаў, а таксама ажыццяўляць адбор моўнага матэрыялу для вывучэння беларускай мовы. Такі падыход забяспечыць практычнае авалоданне моўнымі сродкамі і дасць магчымасць навучэнцам з парушаным слыхам найбольш поўна зразумець і засвоіць літаратурны матэрыял.

Вучэбны прадмет "Беларуская мова і літаратура" вывучаецца ў аб'ёме 2 гадзіны на тыдзень (70 гадзін на год). Гэтыя гадзіны размяркоўваюцца наступным чынам: 23 гадзіны - на вывучэнне беларускай мовы і 47 гадзін - на вывучэнне беларускай літаратуры.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### XI КЛАС
### БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
### (47 гадзін)

### БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТ.

**Беларуская літаратура першай трэці XX ст.** (1 гадзіна)

Літаратурна-грамадскі рух і культурнае развіццё ў 20-я гг. XX ст.

Літаратурныя аб'яднанні таго часу і іх уплыў на развіццё айчыннага пісьменства ("Маладняк", "Узвышша", "Полымя").

Змена становішча беларускіх пісьменнікаў у 30-я гг. XX ст. у сувязі з ідэалагізацыяй літаратурнага жыцця.

Стварэнне Саюза савецкіх пісьменнікаў і Саюза пісьменнікаў БССР (1934).

Развіццё літаратурнага працэсу ў Заходняй Беларусі, сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай.

**Максім Гарэцкі. Апавяданне** "**Літоўскі хутарок**" (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Літоўскі хутарок". Аўтабіяграфічны характар апавядання. Першая сусветная вайна, яе антычалавечная сутнасць. Праўдзівасць паказу трагедыі ў жыцці народа. Вобраз галоўнага героя (Яна Шымкунаса) - прыклад бескарыслівага і гуманнага чалавека.

**Змітрок Бядуля. Апавяданне "Бондар"** (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Бондар". Супрацьпастаўленне вобразаў у апавяданні. Вобраз майстра-працаўніка і вобразы чэрствых і абыякавых людзей.

**Кандрат Крапіва. Камедыя "Хто смяецца апошнім"** (4 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Хто смяецца апошнім". Адлюстраванне ў творы з'яў часу напісання твора. Асноўныя праблемы камедыі, сюжэт, канфлікт.

Сатырычныя вобразы (Гарлахвацкі і Зёлкін). Вобраз Тулягі і змена яго характару на працягу твора. Станоўчыя вобразы (Чарнавус, Левановіч, Вера).

Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

**Мастацтва.** Тэлефільм "Хто смяецца апошнім" (рэж. У.Корш-Саблін).

**Кузьма Чорны. Апавяданне** "**Макаркавых Волька**" (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Макаркавых Волька". Сувязь зместу твора з гістарычнымі абставінамі, з характэрнай для 30-х гг. XX ст. атмасферай падазронасці і недаверу. Супрацьпастаўленне дзвюх жыццёвых пазіцый: гуманістычнай пазіцыі Волькі і паклёпніцкай дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Праявы прыніжэння чалавечай годнасці ў апавяданні і асуджэнне іх аўтарам.

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА СЯРЭДЗІНЫ XX СТ.

**Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941 - 1945)** (1 гадзіна).

Асноўныя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы. Паказ ў творах беларускіх пісьменнікаў жорсткай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму беларускага народа, асуджэнне здраднікаў.

**Пятрусь Броўка. Вершы "Надзя-Надзейка", "Родныя словы"** (2 гадзіны). Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Паказ патрыятызму, непакорнасці беларускага народа і яго палымянай веры ў перамогу. Павага да роднай мовы.

**Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945 - 1965)**

**Аркадзь Куляшоў. Вершы "Мая Бесядзь", "Над брацкай магілай", "Спакойнага жыцця не зычу нікому...", "Я хаце абавязаны прапіскаю...", "На паўмільярдным кіламетры..."** (2 вершы на выбар педагагічнага работніка, 2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Асноўныя тэмы лірыкі паэта. Адметнасць кампазіцыі розных вершаў. Тэмы жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку. Духоўныя каштоўнасці чалавека ў вершах паэта. Паэтычнае майстэрства Аркадзя Куляшова.

**Максім Танк. Вершы "Спатканне", "Родная мова", "Каб ведалі", "Мой хлеб надзённы", "Завушніцы", "Працягласць дня і ночы"** (2 вершы на выбар педагагічнага работніка, 2 гадзіны). **Паэма "Люцыян Таполя"** (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Лірыка. Асноўныя тэмы і вобразы паэзіі. Адлюстраванне духоўнай сілы народа і адзінства пакаленняў. Агульначалавечыя каштоўнасці і духоўны свет чалавека.

"Люцыян Таполя". Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Люцыян Таполя - увасабленне свабодалюбства, таленавітасці беларускага народа. Эпічнае і лірычнае ў творы.

**Янка Брыль. Апавяданне "Memento mori"** (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Memento mori". Адлюстраванне падзей ваеннага часу ў творы. Подзвіг старога селяніна. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Паказ народнага гераізму праз вобраз галоўнага героя.

**Пімен Панчанка. Вершы "Краіна мая", "Герой", "Толькі лісцем рабін шалахні...", "Родная мова", "Крык сойкі", "Той дзень прапаў і страчаны навекі...", "Спарышы"** (2 вершы на выбар педагагічнага работніка, 2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Патрыятычнасць ваеннай паэзіі Пімена Панчанкі. Гераізм і трагізм у паказе абаронцаў Радзімы. Адлюстраванне праўды жыцця, гуманных адносін паміж людзьмі. Лірызм, адкрытасць, шчырасць вершаў.

**Іван Мележ. Раман "Людзі на балоце"** (выбраныя главы, 8 гадзін).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Людзі на балоце". Гісторыя напісання, тэматыка і праблематыка твора. Паказ драматычнага лёсу беларускага народа праз вобразы галоўных герояў. Прыгажосць і трагізм узаемаадносін Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі.

Нацыянальная самабытнасць твора І. Мележа і яго значнасць для развіцця беларускай літаратуры.

**Мастацтва.** Кінафільм "Людзі на балоце" (рэж. В. Тураў).

**Уладзімір Караткевіч. Аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха". Раман "Каласы пад сярпом тваім"** (агляд, 10 гадзін).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Дзікае паляванне караля Стаха". Гістарычная аснова твора. Паказ каларыту мінулай эпохі (80-я гг. XIX ст.). Лёс беларускага народа праз вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асноўныя праблемы твора: дабро і зло, каханне, мужнасць, гераізм.

"Каласы пад сярпом тваім". Асноўныя падзеі рамана і іх сувязь з гісторыяй нашай краіны.

**Мастацтва.** Кінафільм "Дзікае паляванне караля Стаха" (рэж. В.Рубінчык).

**Андрэй Макаёнак. "Зацюканы апостал"** (5 гадзін).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць драматурга.

"Зацюканы апостал". Драма як асаблівы жанр. Трагічнае і камічнае ў творы. Вобразы галоўных герояў п'есы, іх сімвалічнасць і абагульненасць. Сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей у камедыі.

**Мастацтва.** Спектакль "Зацюканы апостал" (рэж. Б. Луцэнка)

**СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ**
**(на выбар педагагічнага работніка)**

*Я.Брыль.* "Галя".

*У.Караткевіч.* "Чазенія".

*А.Куляшоў.* "Маналог".

*М.Лынькоў.* Апавяданні.

*А.Мрый.* "Запіскі Самсона Самасуя".

*І.Навуменка.* "Сасна пры дарозе".

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**(23 гадзіны)**

**Фанетыка і арфаэпія** (2 гадзіны).

Галосныя і зычныя гукі, іх вымаўленне. Арфаэпічныя нормы беларускай мовы.

*Выяўленне адрозненняў арфаэпічных нормаў беларускай мовы ад рускай.*

**Лексіка** (6 гадзін).

Лексічнае значэнне беларускіх слоў. Прамое і пераноснае значэнне. Адназначныя і мнагазначныя словы. Сінонімы, антонімы.

*Падбор рускіх адпаведнікаў да беларускіх слоў (па матэрыялах літаратурных тэкстаў). Падбор беларускіх адпаведнікаў да рускіх слоў (з выкарыстаннем слоўніка і самастойна).*

**Тэкст** (8 гадзін).

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць.

*Успрыманне пісьмовага літаратурнага тэксту.*

*Пераклад тэкстаў (аб'ём - да 12 сказаў) з беларускай мовы на рускую.*

*Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую (аб'ём - да 7 сказаў).*

*Пераказ тэкстаў (аб'ём - да 8 сказаў).*

**Марфалогія** (3 гадзіны).

Сістэма часцін мовы. Часціны мовы, іх агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

*Адрозненне назваў часцін мовы ў рускай і беларускай мовах, асаблівасці іх ужывання.*

**Сінтаксіс** (4 гадзіны).

Простыя і складаныя сказы. Будова сказа, значэнне і ўжыванне.

*Пераклад сказаў з беларускай мовы на рускую і наадварот (па матэрыялах тэкстаў*

*літаратурных твораў).*

**Мяркуемыя вынікі па заканчэнні навучання ў XI класе**

У рамках маўленчай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць:*

лексічнае значэнне вывучаных беларускіх слоў;

адрозненне часцін мовы у рускай і беларускай мовах, асаблівасці іх ужывання;

правілы карыстання руска-беларускім і беларуска-рускім слоўнікамі.

*Навучэнцы будуць умець:*

падбіраць рускія адпаведнікі да беларускіх слоў (самастойна ці з дапамогай слоўніка);

складаць сказы на беларускай мове (самастойна, з дапамогай педагагічнага работніка ці з выкарыстаннем слоўніка);

перакладаць сказы з беларускай мовы на рускую і з рускай на беларускую (самастойна, з дапамогай педагагічнага работніка ці з выкарыстаннем слоўніка).

У рамках камунікатыўнай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць* правілы пабудовы сказа ў беларускай мове.

*Навучэнцы будуць умець:*

успрымаць пісьмовы літаратурны тэкст на беларускай мове;

выконваць моўныя практыкаванні на матэрыяле вывучаных твораў;

адказваць на пытанні па матэрыялах вывучаных твораў;

задаваць пытанні па-беларуску;

даваць параўнальныя характарыстыкі героям мастацкага твора;

пераказваць простыя тэксты на беларускай мове.

У рамках сацыякультурнай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць:*

звесткі з біяграфіі беларускіх аўтараў і іх творы;

сродкі адлюстравання жыцця і спосабы паказу чалавека ў творах розных жанраў.

*Навучэнцы будуць умець:*

выкарыстоўваць сфарміраваныя веды і ўменні для засваення сістэмы каштоўнасных адносін да рэчаіснасці, да людзей, да сябе, зафіксаванай у творах беларускай літаратуры.

## XII КЛАС
## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА
## (47 гадзін)

### БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960 - ПАЧАТКУ 90-х гг.

**Агляд** (1 гадзіна).

Мастацкае адлюстраванне жыцця і духоўнага развіцця народа ў творах беларускіх пісьменнікаў.

Жанры, асноўныя тэмы твораў беларускіх паэтаў (Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц, Алесь Разанаў, Генадзь Пашкоў, Казімір Камейша і інш.).

Тэматыка і праблематыка беларускай прозы (Васіль Быкаў, Іван Мележ, Уладзімір Караткевіч, Іван Шамякін, Іван Навуменка, Міхась Стральцоў, Віктар Казько, Іван Пташнікаў, Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Віктар Карамазаў, Янка Сіпакоў, Алесь Жук, Генрых Далідовіч і інш.).

Асаблівасці драмы і камедыі (п'есы Андрэя Макаёнка, Міколы Матукоўскага, Аляксея Дударава і інш.).

**Іван Шамякін. Раман "Сэрца на далоні"** (7 гадзін).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Сэрца на далоні". Асноўныя праблемы рамана. Вастрыня канфлікту. Зварот да падзей вайны ў рамане. Вобразы Кірылы Шыковіча, Яраша, Зосі Савіч, іх жыццёвы лёс. Вобраз кар'ерыста Гукана. Маладое пакаленне ў рамане. Адлюстраванне праблем узаемаадносін бацькоў і дзяцей.

**Васіль Быкаў. Аповесць "Знак бяды"** (9 гадзін).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Знак бяды". Асноўная праблематыка аповесці. Характары галоўных герояў - Петрака і Сцепаніды. Выкрыццё жорсткасці, бесчалавечнасці фашызму. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму.

Значэнне творчасці Васіля Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

**Міхась Стральцоў. Апавяданне "Сена на асфальце"** (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Сена на асфальце". Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. "Самая патаемная і самая душэўная думка" аўтара-апавядальніка - прымірыць горад і вёску. Прырода ў творы. Кампазіцыя.

**Ніл Гілевіч. Вершы "Край мой беларускі, край...", "Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..", "Страціў слова, страціў спадчыннае слова...", "Паклон табе, мой беларускі краю!.."** (2 вершы на выбар педагагічнага работніка, 3 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Асноўныя тэмы і ідэі паэзіі Ніла Гілевіча.

**Іван Чыгрынаў. Апавяданне "Дзівак з Ганчарнай вуліцы"** (2 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Дзівак з Ганчарнай вуліцы". Ваеннае мінулае і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Паказ традыцыйных каштоўнасцей: гармонія чалавека з прыродай, людзьмі, самім сабой у творы.

**Іван Навуменка. Апавяданне "Сямнаццатай вясной"** (3 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

"Сямнаццатай вясной". Лёс маладых людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Асноўныя вобразы твора (Цімох, Стася і інш.).

**Рыгор Барадулін. Вершы "Неруш", "Яна адна, зямля вякоў...", "Заспаная раніца мжыстая...", "Чалавек не ўзнікае так..."** (1 верш на выбар педагагічнага работніка, 3 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Асноўная тэматыка і праблематыка вершаў Рыгора Барадуліна.

**Яўгенія Янішчыц. Вершы "Ты пакліч мяне. Пазаві...", "Чаму ніколі не баюся я...", "Не воблака, а проста аблачынка...", "Любоў мая..."** (1 на выбар педагагічнага работніка, 3 гадзіны).

Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэтэсы.

Асноўная тэматыка і праблематыка вершаў Яўгеніі Янішчыц.

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**Агляд** (1 гадзіна). Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе.

**Сучасная беларуская паэзія** (Алесь Бадак, Міхась Башлакоў, Навум Гальпяровіч, Мар'ян Дукса, Мікола Мятліцкі, Міхась Пазнякоў, Зоя Падліпская, Генадзь Пашкоў, Алесь Разанаў, Юрась Свірка; 1 - 2 аўтары на выбар педагагічнага работніка, 4 гадзіны).

Асноўная тэматыка і праблематыка вершаў сучасных паэтаў.

**Сучасная беларуская проза** (Алесь Савіцкі. "Пісьмо ў рай"; Уладзімір Сцяпан. Навела "Адна капейка"; Іван Чыгрынаў. "Вяртанне да віны"; Святлана Алексіевіч. "У вайны не жаночае аблічча"; Іван Навуменка. "Вір"; Янка Сіпакоў. "Кулак" і інш. - 1 - 2 аўтары на выбар педагагічнага работніка, 6 гадзін).

Асноўная тэматыка і праблематыка твораў сучасных пісьменнікаў.

**Сучасная беларуская драматургія** (Алесь Петрашкевіч, Сяргей Кавалёў і інш. - 1 аўтар на выбар педагагічнага работніка, 3 гадзіны).

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ
## (на выбар педагагічнага работніка)

**Паэзія**

*М.Башлакоў.* Зб. "Нетры".

*Н.Гілевіч.* "Родныя дзеці".

*В.Зуёнак.* Зб. "Лета трывожных дажджоў".

*М.Мятліцкі.* Зб. "Замкнёны дом".

*Н.Мацяш.* Зб. "Душою з небам гаварыць".

*Г.Пашкоў.* Зб. "У далонях свету".

*А.Пісьмянкоў.* Зб. "Я не памру, пакуль люблю".

*А.Разанаў.* Зб. "У горадзе валадарыць Рагвалод".

*Л.Рублеўская.* Зб. "Замак месячнага сяйва".

*В.Шніп.* Зб. "Балада камянёў".

**Проза**

*Я.Брыль.* Зб. "З людзьмі і сам-насам".

*В.Быкаў.* "Абеліск".

*І.Навуменка.* "Хлопцы самай вялікай вайны".

*І.Чыгрынаў.* "У ціхім тумане".

*Э.Хемінгуэй.* "Стары і мора".

*І.Шамякін.* "Непаўторная вясна" (першая аповесць пенталогіі "Трывожнае шчасце").

**Драматургія**

*А.Дудараў.* "Радавыя".

*А.Петрашкевіч.* "Напісанае застаецца".

*І.Чыгрынаў.* "Следчая справа Вашчылы".

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА
## (23 гадзіны)

**Маўленне** (4 гадзіны).

Асноўныя якасці культуры маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення.

*Складанне простых дыялогаў на беларускай мове (па матэрыялах знаёмай лексікі).*

**Стылістыка** (2 гадзіны).

Стылі маўлення.

*Вызначэнне стыляў тэкстаў (з дапамогай педагагічнага работніка і самастойна).*

**Тэкст** (10 гадзін).

Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення.

*Успрыманне пісьмовага літаратурнага тэксту.*

*Пераклад тэкстаў з беларускай мовы на рускую.*

*Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую.*

*Пераказ тэкстаў (аб'ём - 8 - 10 сказаў).*

**Сінтаксіс** (7 гадзін).

Словазлучэнні, іх віды. Сказ, асноўныя функцыі сказа. Будова сказа, значэнне і ўжыванне. Віды сказаў.

*Пераклад сказаў з беларускай мовы на рускую і наадварот (па матэрыялах тэкстаў літаратурных твораў).*

*Падбор сінанімічных сказаў (з дапамогай педагагічнага работніка і самастойна).*

### Мяркуемыя вынікі па заканчэнні навучання ў XII класе

У рамках маўленчай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць:*

лексічнае значэнне вывучаных беларускіх слоў;

адрозненне часцін мовы ў рускай і беларускай мовах, асаблівасці іх ужывання.

*Навучэнцы будуць умець:*

падбіраць рускія адпаведнікі да беларускіх слоў (па матэрыялах літаратурных тэкстаў) і беларускія адпаведнікі да рускіх слоў (з выкарыстаннем слоўніка і самастойна);

складаць сказы на беларускай мове (самастойна, з дапамогай педагагічнага работніка ці з выкарыстаннем слоўніка);

перакладаць сказы з беларускай мовы на рускую і з рускай на беларускую (самастойна, з дапамогай педагагічнага работніка ці з выкарыстаннем слоўніка).

У рамках камунікатыўнай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць:*

правілы пабудовы сказаў розных відаў (апавядальных і пытальных) у беларускай мове.

*Навучэнцы будуць умець:*

весці просты дыялог на беларускай мове;

успрымаць пісьмовы літаратурны тэкст на беларускай мове;

выконваць моўныя практыкаванні на матэрыяле вывучаных твораў;

даваць параўнальныя характарыстыкі герояў мастацкага твора;

аналізаваць твор ці ўрывак з яго;

пераказваць простыя тэксты на беларускай мове.

У рамках сацыякультурнай кампетэнцыі

*Навучэнцы будуць ведаць:*

звесткі з біяграфіі беларускіх аўтараў і творчы шлях пісьменнікаў;

сродкі адлюстравання жыцця і спосабы паказу чалавека ў творах розных жанраў.

*Навучэнцы будуць умець* выкарыстоўваць сфарміраваныя веды і ўменні для засваення сістэмы каштоўнасных адносін да рэчаіснасці, да людзей, да сябе, зафіксаванай у творах беларускай літаратуры.